(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

УДК 811. 161. 3: 372. 8 (043. 3)

**Гамеза Ларыса Мікалаеўна**

# КОМПЛЕКСНАЯ МЕТАДЫЧНАЯ СІСТЭМА ЎЗБАГАЧЭННЯ СЛОЎНІКАВАГА ЗАПАСУ ШКОЛЬНІКАЎ У ПРАЦЭСЕ НАВУЧАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

*Аўтарэферат дысертацыі*

на атрыманне вучонай ступені

доктара педагагічных навук

па спецыяльнасці 13.00.02 – тэорыя і методыка

навучання і выхавання

(беларуская мова)

Мінск, 2009

Работа выканана ў Беларускім дзяржаўным універсітэце

| | |
|---|---|
| Навуковы кансультант – | **Мурына Ларыса Аляксандраўна**,<br>доктар педагагічных навук, прафесар, галоўны навуковы супрацоўнік лабараторыі моўнай адукацыі Навукова-метадычнай установы "Нацыянальны інстытут адукацыі" Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь |
| Афіцыйныя апаненты: | **Лукашанец Аляксандр Аляксандравіч**,<br>доктар філалагічных навук, прафесар, дырэктар Дзяржаўнай навуковай установы "Інстытут мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі" |
| | **Паўлоўскі Іван Іванавіч**,<br>доктар педагагічных навук, дацэнт, галоўны навуковы супрацоўнік Навукова-даследчага цэнтра Навукова-метадычнай установы "Нацыянальны інстытут адукацыі" Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь |
| | **Чэчат Віктар Уладзіміравіч**,<br>доктар педагагічных навук, прафесар, прафесар кафедры прыватных методык Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М. Танка" |
| Апаніруючая арганізацыя – | Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П. М. Машэрава" |

Абарона адбудзецца "2" чэрвеня 2009 г. у 14.30 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.21 пры Беларускім дзяржаўным універсітэце па адрасе: 220050, г. Мінск, вул. К. Маркса, 31; тэл. 209-55-58.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Аўтарэферат разасланы "  " красавіка 2009 г.

Вучоны сакратар савета
па абароне дысертацый
кандыдат педагагічных навук,
дацэнт Т. У. Ігнатовіч

# УВОДЗІНЫ

Узбагачэнне слоўнікавага запасу школьнікаў – адна з важных задач навучання мове, ад вырашэння якой залежыць узровень маўленчай культуры вучняў. Канцэпцыя моўнай адукацыі ў агульнаадукацыйных установах Рэспублікі Беларусь і распрацаваныя на яе аснове адукацыйны стандарт і праграма па беларускай мове арыентуюць на фарміраванне маўленчай культуры школьнікаў, авалоданне ведамі і практычнымі ўменнямі, якія забяспечваюць эфектыўную маўленчую дзейнасць у тыповых сітуацыях камунікацыі. Аднак у апошнія гады адзначаецца ўплыў на іх маўленчую практыку прастамоўяў, жарганізмаў, запазычаных слоў. Акрамя таго, школьнікі з дастаткова высокім узроўнем лінгвістычных ведаў сутыкаюцца з цяжкасцямі пры стварэнні ўласных выказванняў. Гэта тлумачыцца ў першую чаргу адсутнасцю ў іх належнага слоўнікавага запасу для выкарыстання ў розных відах маўленчай дзейнасці.

У метадычнай навуцы да 70-х гадоў XX стагоддзя ўзбагачэнне слоўнікавага запасу школьнікаў разглядалася як слоўнікавая работа, якая праводзілася выключна на практычнай аснове пры падрыхтоўцы да напісання пераказаў і сачыненняў (П. А. Афанасьеў, В. А. Дабрамыслаў, М. А. Рыбнікава).

У 70 – 80-я гады ў сувязі з уключэннем у праграмы па беларускай і рускай мовах для вывучэння ў V класе новага раздзела "Лексіка. Фразеалогія" работа па ўзбагачэнні слоўнікавага запасу школьнікаў пашырылася за кошт тэарэтычнай асновы – засваення вучнямі сістэмных сувязей лексіка-семантычнага ўзроўню: тэматычных груп слоў, сінанімічных радоў, антанімічных пар (М. Т. Баранаў, В. І. Капінос, А. Ю. Купалава, А. В. Пруднікава). У методыцы выкладання рускай мовы ў гэты перыяд былі атрыманы даныя на аснове вывучэння пісьмовых работ – пераказаў, а таксама вусных выказванняў аб нізкім ўзроўні слоўнікавага запасу школьнікаў пачатковых класаў (М. Т. Баранаў, І. Я. Сініца).

Праблему ўзбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў у аспекце развіцця маўлення і фарміравання лексічных уменняў даследавалі і беларускія вучоныя (Г. М. Валочка, В. П. Красней, В. А. Ляшчынская, Ф. М. Літвінка, Л. А. Мурына, Г. І. Нікалаенка, І. І. Паўлоўскі, В. У. Протчанка, М. Г. Яленскі). Адзначым, што ў даследаваннях беларускіх вучоных-лінгвадыдактаў узбагачэнне слоўнікавага запасу школьнікаў суадносілася таксама з навучаннем лексіцы і падрыхтоўкай да напісання творчых відаў работ. Узровень слоўнікавага запасу школьнікаў як малодшых, так і старшых класаў не быў прадметам спецыяльнага даследавання. І гэта з'яўляецца аб'ектыўнай цяжкасцю пры арганізацыі работы па ўзбагачэнні слоўнікавага запасу вучняў V – VIII класаў. У гэтых класах слова вывучаецца ў кожным раздзеле

школьнага курса беларускай мовы, таму і работа па ўзбагачэнні слоўнікавага запасу вучняў заканамерна павінна праводзіцца пры навучанні ўсім раздзелам з улікам унутрыпрадметных сувязей паміж узроўнямі моўнай сістэмы.

Пачынаючы з 90-х гадоў XX стагоддзя аб'ектамі моўнай адукацыі ў агульнаадукацыйных установах Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца мова і маўленне. У працэсе засваення ведаў аб сістэме мовы і функцыянаванні моўных адзінак у маўленні вучні авалодваюць моўнымі паняццямі (моўны напрамак); пры засваенні маўленчай тэорыі - маўленча-камунікатыўнымі паняццямі (маўленча-камунікатыўны напрамак). Кожны напрамак мае сваю сістэму паняццяў і тэрмінаў, якія павінны складаць тэарэтычныя асновы ўзбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў для фарміравання моўнай і маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі. Акрамя таго, да тэарэтычных асноў узбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў павінны адносіцца сістэмныя аб'яднанні слоў розных часцін мовы і вобразна-выяўленчыя сродкі мовы для выкарыстання іх у розных відах маўленчай дзейнасці. Вылучаныя тэарэтычныя асновы ўзбагачэння слоўнікавага запасу вучняў: 1) моўныя паняцці ўсіх узроўняў моўнай сістэмы; 2) маўленча-камунікатыўныя паняцці, неабходныя для фарміравання ўменняў карыстацца мовай у розных відах маўленчай дзейнасці; 3) сістэмныя аб'яднанні слоў розных часцін мовы; 4) семантычны сегмент усіх лінгвістычных з'яў (артыкуляцыйна-вымаўленчыя, фанетыка-стылістычныя характарыстыкі слоў, лексічныя значэнні слоў, лексічныя вобразна-выяўленчыя сродкі мовы, семантычная прырода словаўтваральных марфем, сэнсавыя і маўленчыя характарыстыкі марфалагічных формаў) з'яўляюцца сукупнасцю моўных і маўленча-камунікатыўных з'яў, паняццяў, якія знаходзяцца ва ўзаемасувязі і ўтвараюць цэласнасць і адзінства працэсу навучання і ўзбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў і таму патрабуюць новай *комплекснай метадычнай сістэмы ўзбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў* у працэсе навучання беларускай мове.

*Метадычная сістэма ўзбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў* з'яўляецца *комплекснай*, паколькі прадугледжвае работу над словам у комплексе яго характарыстык з улікам існуючых сувязей паміж узроўнямі моўнай сістэмы (наяўнасць аднаго націску ў слове, фанетычная аформленасць і немагчымасць уставак і змен унутры слова, аднесенасць слова да пэўнай часціны мовы і яго граматычная аформленасць, наяўнасць значэння і асаблівасцей ужывання слова ў маўленні) і фарміраванне ўменняў асэнсаванага выкарыстання моўных, маўленча-камунікатыўных паняццяў, сродкаў мастацкай выразнасці ў тэкстах розных тыпаў, стыляў, жанраў на аснове распрацаванай трохузроўневай сістэмы вербальна-семантычных, тэзаўрусных, прагматычных практыкаванняў, што з'яўляецца канцэптуальна новым вырашэннем адной з галоўных праблем у сучаснай методыцы.

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПРАЦЫ

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі**

Тэма дысертацыйнага даследавання распрацоўвалася ў межах навуковых даследаванняў, зацверджаных Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь: "Метадычнае забеспячэнне выкладання беларускай мовы і літаратуры ў святле рэформы адукацыі ў вышэйшай і сярэдняй школе" (1996 – 2000 гг., дзяржаўны рэгістрацыйны нумар 19962107); "Тэарэтычныя і практычныя праблемы рыторыкі і методыкі выкладання беларускай мовы і літаратуры ў ВНУ і сярэдніх навучальных установах" (2001 – 2005 гг., дзяржаўны рэгістрацыйны нумар 20012506); "Мадэрнізацыя і распрацоўка зместу варыятыўнай адукацыі: методык і сродкаў навучання, выхавання і ўмацавання здароўя навучэнцаў у нацыянальнай сістэме адукацыі" ў межах задання 01 "Распрацаваць навукова-метадычнае забеспячэнне гуманітарнай адукацыі ў кантэксце фарміравання ў вучняў грамадзянскай, духоўна-маральнай, камунікатыўнай і мастацкай культуры як сродку рэалізацыі асобасна арыентаванага і культуралагічнага падыходаў" (2006 – 2008 гг., дзяржаўны рэгістрацыйны нумар 20063636).

**Мэта і задачы даследавання**

Мэта даследавання – тэарэтычнае абгрунтаванне і распрацоўка комплекснай метадычнай сістэмы ўзбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў V – VIII класаў у працэсе навучання беларускай мове з улікам унутрыпрадметных сувязей паміж моўнымі ўзроўнямі; практычная рэалізацыя прапанаванай комплекснай метадычнай сістэмы ў агульнаадукацыйных установах Рэспублікі Беларусь.

Дасягненне пастаўленай мэты ажыццяўлялася шляхам вырашэння наступных задач:

– выявіць тэарэтычныя асновы комплекснай метадычнай сістэмы ўзбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў V – VIII класаў у працэсе навучання беларускай мове, лінгвістычныя рэсурсы ўнутрыпрадметных сувязей паміж раздзеламі прадмета;

– вызначыць сучасныя метадычныя напрамкі, падыходы, прынцыпы ўзбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў у працэсе навучання беларускай мове з улікам унутрыпрадметных сувязей паміж моўнымі ўзроўнямі;

– вылучыць новы змест узбагачэння слоўнікавага запасу: моўныя, маўленча-камунікатыўныя паняцці школьнага курса беларускай мовы; лексічныя, лексіка-граматычныя, лексіка-стылістычныя сродкі стварэння вобразнасці і выразнасці маўлення; распрацаваць тыпалогію практыкаванняў для рэалізацыі новага зместу;

– вызначыць тыповыя маўленчыя недахопы школьнікаў V, VIII класаў; выявіць прычыны ўзнікнення маўленчых недахопаў на аснове вынікаў канстатуючага эксперыменту;

– падрыхтаваць навукова-метадычнае забеспячэнне працэсу ўзбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў: слоўнікі моўных, маўленча-камунікатыўных тэрмінаў; комплексны лексічны слоўнік беларускай мовы;

– распрацаваць комплексную методыку ўзбагачэння слоўніка школьнікаў V – VIII класаў у працэсе навучання беларускай мове з улікам ўнутрыпрадметных сувязей паміж моўнымі ўзроўнямі і праверыць яе эфектыўнасць.

**Аб'ект і прадмет даследавання**

Аб'ект даследавання – працэс узбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў пры навучанні беларускай мове з улікам унутрыпрадметных сувязей паміж моўнымі ўзроўнямі ў V – VIII класах агульнаадукацыйных устаноў.

Прадмет даследавання – комплексная метадычная сістэма ўзбагачэння слоўніка школьнікаў V – VIII класаў моўнымі, маўленча-камунікатыўнымі паняццямі, вобразна-выяўленчымі сродкамі ў працэсе навучання беларускай мове.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

На абарону выносіцца новая комплексная метадычная сістэма, накіраваная на ўзбагачэнне слоўніка школьнікаў V – VIII класаў моўнымі, маўленча-камунікатыўнымі паняццямі, лексічнымі, лексіка-стылістычнымі і лексіка-граматычнымі вобразна-выяўленчымі сродкамі ў працэсе навучання беларускай мове з улікам ўнутрыпрадметных сувязей паміж living рознымі моўнымі ўзроўнямі.

1. Працэс навучання беларускай мове ў агульнаадукацыйнай установе аб'ядноўвае дзве ўзаемазвязаныя мэты: *засваенне сістэмы мовы* і *развіццё маўлення*, што вызначае адбор *тэарэтычных асноў* комплекснай метадычнай сістэмы ўзбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў V – VIII класаў для фарміравання іх моўнай, маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі.

Слова як адзінка моўнай сістэмы з'яўляецца аб'ектам навучання ў кожным раздзеле школьнага курса беларускай мовы, таму работа па ўзбагачэнні слоўнікавага запасу вучняў заканамерна павінна праводзіцца на аснове ўнутрыпрадметных сувязей адзінак усіх узроўняў моўнай сістэмы. Артыкуляцыйна-вымаўленчыя і фанетыка-стылістычныя характарыстыкі слоў, лексічныя значэнні слоў, лексічныя сродкі выразнасці, семантычная прырода словаўтваральных марфем, сэнсавыя і маўленчыя характарыстыкі марфалагічных формаў - семантычны сегмент усіх лінгвістычных з'яў - з'яўляюцца лінгвістычнымі рэсурсамі ўнутрыпрадметных сувязей паміж усімі

моўнымі ўзроўнямі і тэарэтычнымі асновамі комплекснай метадычнай сістэмы ўзбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў V – VIII класаў.

2. У адпаведнасці з мэтамі навучання беларускай мове школьнікі павінны асэнсаваць моўныя сродкі (*моўны напрамак* узбагачэння слоўнікавага запасу) і асаблівасці выкарыстання іх у розных відах маўленчай дзейнасці ў залежнасці ад задач маўленчых зносін (*маўленча-камунікатыўны напрамак* узбагачэння слоўнікавага запасу). Галоўнымі *падыходамі*, што вызначаюць тэарэтычную і метадычную асновы ўзбагачэння слоўнікавага запасу вучняў, з'яўляюцца *сістэмна-функцыянальны*, які забяспечвае засваенне моўных паняццяў, і *камунікатыўна-дзейнасны*, які дапамагае вучням засвоіць маўленча-камунікатыўныя паняцці, ствараць самастойныя выказванні розных тыпаў, стыляў і жанраў. Сфармуляваныя намі *спецыфічныя прынцыпы* ўзбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў (спасціжэння семантыкі і граматычнай афармленасці; выяўлення сістэмных сувязей лексіка-семантычнага, лексіка-граматычнага ўзроўняў; спалучальнасці слоў) рэалізуюцца ў працэсе навучання беларускай мове з улікам унутрыпрадметных сувязей паміж раздзеламі "Лексіка. Фразеалогія", "Склад слова. Словаўтварэнне і арфаграфія", "Марфалогія і арфаграфія" на ўзроўні мнагазначнасці, сінаніміі, антаніміі, аманіміі марфем, граматычных формаў слоў.

3. Новы змест узбагачэння слоўнікавага запасу ўключае: *моўныя паняцці* (фанетыка-арфаэпічныя, лексіка-фразеалагічныя, марфемна-словаўтваральныя, марфалагічныя), якімі школьнікі павінны авалодваць пры вывучэнні ўсіх моўных узроўняў для фарміравання моўнай кампетэнцыі; *маўленча-камунікатыўныя паняцці* (тэкставыя, тыпалагічна-кампазіцыйныя, жанрава-стылістычныя), неабходныя для фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі; *вобразна-выяўленчыя моўныя (лексічныя, лексіка-граматычныя, лексіка-стылістычныя) сродкі* для выкарыстання іх у тэкстах розных тыпаў, стыляў маўлення. Распрацаваная тыпалогія практыкаванняў па ўзбагачэнні слоўнікавага запасу вучняў складаецца з *вербальна-семантычных* (авалоданне моўнымі і маўленча-камунікатыўнымі паняццямі), *тэзаўрусных* (практычнае выкарыстанне паняццяў на ўсіх моўных узроўнях), *прагматычных практыкаванняў* (аналіз лексічных, лексіка-граматычных, лексіка-стылістычных сродкаў у тэкстах; стварэнне вобразнага, эмацыянальнага, метафарычнага выказвання) і накіравана на фарміраванне адпаведных (*моўных, маўленча-камунікатыўных) уменняў.*

4. Вынікі канстатуючага эксперыменту ў V і VIII класах выявілі найбольш тыповыя маўленчыя недахопы, дапушчаныя *на лексіка-фразеалагічным узроўні* (падмена вызначэння лексічнага значэння слова перакладам яго на рускую мову; няўменне падбіраць сінонімы, антонімы да ўсіх значэнняў мнагазначных слоў; парушэнне лексічнай спалучальнасці і інш),

*марфемна-словаўтваральным узроўні* (няўменне падбіраць аднакаранёвыя словы, выяўляць сінанімічныя, антанімічныя, аманімічныя марфемы і інш.), *марфалагічным узроўні* (няўменне ствараць сінанімічныя граматычныя канструкцыі, вызначаць сэнсава-стылістычную ролю часцін мовы, выяўляць стылістычную афарбоўку службовых часцін мовы і інш.).

Маўленчыя недахопы з'яўляюцца вынікам няведання тэарэтычнага матэрыялу па лексіцы, семантычнага і функцыянальнага аспектаў тэорыі фанетыкі, словаўтварэння, марфалогіі і абмежаванага актыўнага слоўнікавага запасу. Вучні не валодаюць дастатковай колькасцю ключавых, тэматычна абумоўленых слоў ці спалучэнняў слоў, сінанімічнымі і антанімічнымі паралелямі, вобразна-выяўленчымі моўнымі сродкамі, не ўспрымаюць часціны мовы як лексіка-граматычныя і функцыянальныя групы слоў, марфемы як носьбіты абстрактнага значэння.

5. Слоўнікі-мінімумы моўных, маўленча-камунікатыўных тэрмінаў, вылучаных на аснове дыдактычнага матэрыялу школьных падручнікаў па беларускай мове, комплексны лексічны слоўнік беларускай мовы з'яўляюцца *навукова-метадычным забеспячэннем* тэарэтычнай і практычнай работы па ўзбагачэнні слоўнікавага запасу школьнікаў. *Адбор і структураванне зместу тэрміналагічных слоўнікаў* ажыццяўляліся на аснове *метадычных прынцыпаў* (мінімізацыі тэрмінаў, размежавання тэрмінаў на ўзроўні мовы і маўлення, тэрміналагічна-апісальным). Тэарэтычнай асновай комплекснага лексічнага слоўніка беларускай мовы з'яўляюцца сінонімы, антонімы, амонімы, паронімы. Матэрыял слоўніка выбраны з літаратурных твораў, што вывучаюцца ў агульнаадукацыйных установах, а таксама тэкстаў, якія змешчаны ў адпаведных падручніках па беларускай мове. *Адбор і структураванне зместу комплекснага лексічнага слоўніка беларускай мовы* ажыццяўляліся на аснове *лінгваметадычных прынцыпаў* (частотнасці слоў, сістэмна-лексічнага, лексіка-граматычнага). Распрацаваная метадычная сістэма работы са слоўнікамі пры вывучэнні раздзелаў школьнага курса беларускай мовы прайшла праверку ў эксперыментальных агульнаадукацыйных установах і ўведзена ў практыку навучання беларускай мове.

6. Распрацаваная *новая комплексная методыка* заснавана на сістэмна-функцыянальным, камунікатыўна-дзейнасным падыходах, *прынцыпах* узбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў, *новым лінгвістычным і маўленчым змесце*, выдзеленым на аснове ўнутрыпрадметных сувязей, сістэме практыкаванняў, накіраванай на актывізацыю ўсяго комплексу моўных і маўленча-камунікатыўных уменняў, якія забяспечваюць *замацаванне паняццяў*, аваloданне *практычнай дзейнасцю на аснове засвоеных паняццяў* і ўвядзенне *моўных і маўленча-камунікатыўных сродкаў у творчыя віды дзейнасці*. Эфектыўнасць новай комплекснай методыкі ўзбагачэння слоўнікавага запасу

вучняў пацверджана ў межах навучальнага і кантрольнага эксперыментаў, што дало падставы для яе ўкаранення ў практыку навучання беларускай мове ў агульнаадукацыйных установах Рэспублікі Беларусь.

**Асабісты ўклад суіскальніка**

У дысертацыі, якая з'яўляецца вынікам самастойнага даследавання аўтара, упершыню ў беларускай лінгваметодыцы:

– вылучаны тэарэтычныя асновы комплекснага ўзбагачэння слоўнікавага запасу вучняў у працэсе навучання ўсім раздзелам школьнага курса беларускай мовы з улікам унутрыпрадметных сувязей;

– сфармуляваны ў адпаведнасці з сістэмна-функцыянальным, камунікатыўна-дзейнасным падыходамі да навучання новыя прынцыпы ўзбагачэння слоўнікавага запасу вучняў (узбагачэнне слоўніка на аснове спасціжэння семантыкі і граматычнай афармленасці, сістэмных сувязей лексіка-семантычнага, лексіка-граматычнага ўзроўняў, спалучальнасці слоў);

– вызначаны новы змест узбагачэння слоўнікавага запасу: моўныя, маўленча-камунікатыўныя паняцці, вобразна-выяўленчыя моўныя сродкі; распрацавана тыпалогія вербальна-семантычных, тэзаўрусных і прагматычных практыкаванняў для рэалізацыі новага зместу;

– падрыхтавана навукова-метадычнае забеспячэнне працэсу ўзбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў: слоўнікі моўных, маўленча-камунікатыўных тэрмінаў; комплексны лексічны слоўнік беларускай мовы (сінонімаў, антонімаў, амонімаў, паронімаў);

– распрацавана, эксперыментальна праверана і ўведзена ў практыку навучання беларускай мове ў агульнаадукацыйных установах комплексная метадычная сістэма ўзбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў V - VIII класаў у працэсе навучання ўсім раздзелам школьнага курса беларускай мовы з улікам унутрыпрадметных сувязей, якая забяспечвае замацаванне моўных і маўленча-камунікатыўных паняццяў, авалоданне практычнай дзейнасцю на аснове засвоеных моўных і маўленча-камунікатыўных паняццяў і ўвядзенне засвоеных моўных і маўленча-камунікатыўных сродкаў у творчыя віды дзейнасці.

Вывады і вынікі працы выкарыстаны ў вучэбна-метадычных дапаможніках па методыцы выкладання беларускай мовы для настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры і студэнтаў філалагічных факультэтаў, на лекцыях, семінарскіх і практычных занятках, рэалізуюцца ў працэсе педагагічнай практыкі студэнтаў.

Уклад іншых выканаўцаў у сумесна апублікаваных працах не мае непасрэдных адносін да адлюстравання вынікаў дадзенага даследавання, рэалізаванага суіскальнікам асабіста.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі**

Вынікі даследавання абмяркоўваліся на навукова-метадычных семінарах, круглых сталах на філалагічным факультэце БДУ (2000 – 2008 гг.), рэспубліканскім навукова-метадычным семінары "Обучающие игры в системе непрерывного образования" (Мінск, май 1996 г.), рэспубліканскіх канферэнцыях "Узаемасувязі выкладання беларускай і рускай моў і літаратур" (Мінск, сакавік 1991 г.), "Навучальны працэс і шляхі яго інтэнсіфікацыі" (Мінск, 1991 г.), рэспубліканскай навукова-метадычнай канферэнцыі, прысвечанай 110-й гадавіне з дня нараджэння Якуба Коласа (Мінск, лістапад 1992 г.), рэспубліканскай навукова-метадычнай канферэнцыі "Пути повышения качества профессиональной подготовки педагогических кадров с университетским образованием" (Мінск, кастрычнік 1995 г.), міжнародных навуковых канферэнцыях "Беларуская мова ў другой палове XX стагоддзя" (Мінск, кастрычнік 1997 г.), "Язык и социум" (Мінск, снежань 1998 г.; снежань 2004 г.), "Мова – літаратура – культура" (Мінск, 1999 г.), "Мова і культура" (Кіеў, чэрвень 2005 г.), міжнародных навукова-тэарэтычных канферэнцыях "Тэорыя і практыка навучання мовам, літаратурам і рыторыцы" (Мінск, снежань 1997 г.), міжнародных Купалаўскіх чытаннях (Гродна, 1998 г.), міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Педагогическое образование в классическом университете" (Мінск, кастрычнік 2000 г.), рэспубліканскай міжвузаўскай навукова-метадычнай канферэнцыі "Практыка як састаўная частка прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў" (Мінск, люты 2000 г.), навукова-метадычных канферэнцыях "Сацыяльна-гуманітарныя навукі ў сістэме вышэйшай школы" (Мінск, люты 2002 г.), "Сацыяльна-культурная дзейнасць: метадалогія, змест, методыка" (Мінск, люты 2003 г.), міжнародных навуковых канферэнцыях "Многоуровневая система подготовки филологов: организация содержания и новые технологии обучения" (Мінск, кастрычнік 2003 г.), "Текст в лингвистической теории и в методике преподавания филологических дисциплин" (Мазыр, май 2005 г.), IV Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Текст. Язык. Человек" (Мазыр, май 2007 г.), IX - XII Міжнародных Кірыла-Мяфодзіеўскіх чытаннях, прысвечаных Дням славянскага пісьменства і культуры (Мінск, май 2003 г.; май 2004 г.; май 2005 г.; май 2006 г.), міжнародным форуме русістаў "Современное языковое и литературное образование в СНГ: диалог между теорией и практикой" (Мінск, 10 – 12 лістапада 2008 г.). Асноўныя палажэнні і вынікі даследавання абмяркоўваліся на пасяджэннях кафедры рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры, вучонага савета БДУ.

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі**

Вынікі даследавання знайшлі адлюстраванне ў 73 публікацыях, з іх 19 адпавядаюць патрабаванням пункта 18 Палажэння аб прысуджэнні вучоных

ступеней і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь: 1 манаграфія (8,8 д.а.), 1 слоўнік (17,7 д.а.), 18 артыкулаў у рэцэнзуемых навуковых часопісах (8,1 д.а.). Іншыя публікацыі па тэме, якія пацвярджаюць практычную значнасць дысертацыйнага даследавання: 17 артыкулаў у навукова-метадычных зборніках, 24 матэрыялы навуковых, навукова-метадычных і навукова-практычных канферэнцый, 1 тэзісы даклада, 7 вучэбна-метадычных дапаможнікаў, 4 вучэбныя праграмы. Агульны аб'ём апублікаваных матэрыялаў складае 60,3 д.а.

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Тэкст дысертацыі складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі працы, чатырох глаў, заключэння, бібліяграфічнага спісу і 2 дадаткаў. Поўны аб'ём дысертацыі - 264 с., у тым ліку 16 табліц на 9 с., 2 дадаткі на 20 с., бібліяграфічны спіс (301 назва выкарыстаных крыніц і 73 назвы публікацый аўтара) на 28 с.

## СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ ПРАЦ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ


**Манаграфія**

1. Гамеза, Л. М. Лінгваметадычная сістэма ўзбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў V – VII класаў / Л. М. Гамеза. – Мінск: БДУ, 2002. – 134 с.

**Артыкулы ў навукова-метадычных часопісах**

2. Гамеза, Л. М. Каб мова загучала мілагучна / Л. М. Гамеза // Роднае слова.– 1993. – № 6.– С. 38 – 43.

3. Гамеза, Л. М. Вывучэнне фразеалогіі беларускай мовы ў школе (V клас) / Л. М. Гамеза // Роднае слова. – 1997. – № 8. – С. 79 – 83.

4. Гамеза, Л. М. Выкладанне лексікі беларускай мовы ў функцыянальна-камунікатыўным аспекце. Адназначныя і мнагазначныя словы. Прамое і пераноснае значэнне слоў / Л. М. Гамеза // Роднае слова. – 1998. – № 10.– С. 119 – 125.

5. Гамеза, Л. М. Тэма ўрока: "Антонімы" / Л. М. Гамеза // Роднае слова – 1999. – № 10.– С. 141 – 143.

6. Гамеза, Л. М. Работа над арфаэпічнымі нормамі на ўроках беларускай мовы / Л. М. Гамеза // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Сер. 4. Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. – 2000.– № 2. – С. 87 – 90.

7. Гамеза, Л. М. Узбагачэнне слоўнікавага запасу школьнікаў: гісторыя пытання / Л. М. Гамеза // Беларуская мова і літаратура. – 2000. – № 3. – С. 98 – 102.

8. Гамеза, Л. М. Вывучэнне фанетыкі ў школьным курсе беларускай мовы / Л. М. Гамеза // Роднае слова. – 2001. – № 5. – С. 63 – 66.

9. Гамеза, Л. М. Узбагачэнне слоўнікавага запасу школьнікаў пры вывучэнні словаўтварэння / Л. М. Гамеза // Роднае слова. – 2002. – № 3. – С. 53 – 55.

10. Гамеза, Л. М. Узбагачэнне слоўнікавага запасу школьнікаў пры вывучэнні прыметніка ў VI класе / Л. М. Гамеза // Беларуская мова і літаратура. – 2002. – № 4. – С. 24 – 48.

11. Гамеза, Л. М. Узбагачэнне слоўнікавага запасу школьнікаў пры вывучэнні назоўніка / Л. М. Гамеза // Роднае слова. – 2002. – № 8. – С. 70 – 73.

12. Гамеза, Л. М. Узбагачэнне слоўнікавага запасу школьнікаў пры вывучэнні дзеяслова / Л. М. Гамеза // Роднае слова. – 2003. – № 5. – С. 60 – 61.

13. Гамеза, Л. М. Вывучэнне раздзела "Словаўтварэнне" ў функцыянальна-семантычным аспекце / Л. М. Гамеза // Роднае слова. – 2004. – № 6. – С. 65 – 67.

14. Гамеза, Л. М. Узбагачэнне слоўнікавага запасу школьнікаў пры вывучэнні прыслоўяў (VII клас) / Л. М. Гамеза // Беларуская мова і літаратура.– 2005. – № 2. – С. 46 – 48.

15. Гамеза, Л. М. Узбагачэнне слоўнікавага запасу школьнікаў пры вывучэнні службовых часцін мовы (VIII клас) / Л. М. Гамеза // Беларуская мова і літаратура. – 2005. – № 4. – С. 27 – 31.

16. Гамеза, Л. М. Лінгваметадычныя асновы ўзбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў пры вывучэнні беларускай мовы / Л. М. Гамеза // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Сер. 4. Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. – 2005. – № 1. – С. 107 – 112.

17. Гамеза, Л. М. Вывучэнне марфалогіі ў функцыянальна-семантычным аспекце / Л. М. Гамеза // Роднае слова. – 2005. – № 7. – С. 73 – 74.

18. Гамеза, Л. М. Рэалізацыя камунікатыўна-дзейнаснага падыходу ў працэсе ўзбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў / Л. М. Гамеза // Беларуская мова і літаратура. – 2007. - № 6. – С. 8 - 15.

19. Гамеза, Л. М. Комплексная методыка ўзбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў пры вывучэнні словаўтварэння / Л. М. Гамеза // Беларуская мова і літаратура.- 2008. - № 6. – С. 3 – 8.

**Артыкулы ў навуковых зборніках**

20. Гамезо, Л. Н. Подготовка студентов-филологов университета к воспитательной работе по предмету в школе / Л. Н. Гамезо, Л. А. Мурина, И. Э. Савко // Педагогика высшей и средней специальной школы : межвед. сб. / редкол.: М. У. Пискунов (гл. ред.) [и др. ]. – Минск: Университетское, 1989. – Вып. 3. – С. 49 – 54.

21. Гамеза, Л. М. Аб некаторых пытаннях методыкі выкладання беларускай мовы / Л. М. Гамеза, Л. А. Мурына // Беларуская мова : міжвед. зб. / рэдкал.: У. В. Анічэнка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Універсітэцкае, 1989. – Вып. 17. – С. 150 – 156.

22. Гамеза, Л. М. Педагагічная творчасць на ўроку / Л. Н. Гамезо // Беларуская мова : міжвед. зб. / рэдкал.: У. В. Анічэнка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Універсітэцкае, 1992. – Вып. 19. – С. 98 – 108.

23. Гамеза, Л. М. "Школа" і "адвольнае выступленне" (Аб метадах навучання лексіцы ў сярэдняй школе) / Л. М. Гамеза // Беларуская мова : міжвед. зб. / рэдкал. : У. В. Анічэнка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Універсітэцкае, 1993. – Вып. 20. – С. 77 – 86.

24. Гамеза, Л. М. Сістэма работы па выяўленні сэнсава-стылістычнай і тэкстаўтваральнай ролі прыслоўяў на ўроках беларускай мовы ў школе / Л. М. Гамеза // Коммуникативная компетенция: принципы, методы, приемы формирования : сб. науч. ст. / под ред. Л. А. Муриной, Ф. М. Литвинко. – Минск: БГУ, 2000. – Вып. 2. – С. 3 –5.

25. Гамеза, Л. М. Засваенне граматычных нормаў – важная ўмова павышэння культуры мовы / Л. М. Гамеза // Культура Беларусі: стан і перспектывы

развіцця : зб. арт. / пад рэд. Я. Д. Грыгаровіч, П. Р. Ігнатовіча. – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры, 2001. – С. 159 – 161.

26. Гамеза, Л. М. Узбагачэнне слоўнікавага запасу школьнікаў пры вывучэніі прыназоўнікаў / Л. М. Гамеза // Метадалагічныя і метадычныя аспекты выкладання мовы і літаратуры ў школе і ВНУ : зб. навук. арт., прысвечаны памяці праф. В. У. Протчанкі / пад рэд. Л. М. Мурынай. – Мінск: БДУ, 2002. – Вып. 1. – С. 13 – 16.

27. Гамеза, Л. М. Сучасныя падыходы да вывучэння пунктуацыі ў школе / Л. М. Гамеза // Метадалагічныя і метадычныя аспекты выкладання мовы і літаратуры ў школе і ВНУ : зб. навук. арт. / пад рэд. Л. М. Мурынай. – Мінск: БДУ, 2003. – Вып. 2. – С. 22 – 24.

28. Гамеза, Л. М. Артыкуляцыйныя, акустычныя і функцыянальныя аспекты маўлення / Л. М. Гамеза // Метадалагічныя і метадычныя аспекты выкладання мовы і літаратуры ў школе і ВНУ : зб. навук. арт. / пад рэд. Л. А. Мурынай. – Мінск: РІВШ БДУ, 2004. – Вып. 3. – С. 19 – 23.

29. Гамеза, Л. М. Практыкаванні аналітычнага, рэпрадуктыўнага, аналітыка-сінтэтычнага і прадуктыўнага характару ва ўзбагачэнні слоўніка вучняў / Л.М. Гамеза // Коммуникативная компетенция: принципы, методы, приемы формирования : сб. науч. ст. / под ред. Л. А. Муриной, Ф .М. Литвинко. – Минск, РИВШ БГУ, 2004. – Вып. 6. – С. 6 – 10.

30. Гамеза, Л. М. Шляхі рацыяналізацыі самастойнай работы студэнтаў-філолагаў (пры вывучэнні курса лінгвадыдактыкі) / Л. М. Гамеза // Инновационные методические решения в преподавании филологических дисциплин : сб. науч. ст. / под ред. Л. А. Муриной, Ф. М. Литвинко. – Минск: РИВШ БГУ, 2004. – С. 3 – 4.

31. Гамезо, Л. Н. Значение школьного семонимического словаря для формирования языковой личности учащихся / Л. Н. Гамезо // Развитие образования в странах СНГ. Русский язык в формировании единого образовательного пространства СНГ: Россия – Беларусь / Ин-т теории и истории педагогики РАО : сб. науч. ст. / под ред. доктора пед. наук А. А. Мурашова. – М., 2005. - Вып. 7. – С. 18 – 21.

32. Гамезо, Л. Н. Использование школьного семонимического словаря в формировании речевой культуры учащихся / Л. Н. Гамезо // Язык и культура. Культурологический подход к преподаванию языка и литературы / Ин-т филологии Киевского национального ун-та имени Тараса Шевченко, Ин-т языковевения им. А. А. Потебни НАН Украины, Ин-т психологии им. Г. С. Костюка АПН Украины: науч. изд. / гл.ред. Д. С. Бураго. – Киев, 2005. – Сер. «Филол.». Вып. 8. Т.7. – С.134 – 137.

33. Гамеза, Л. М. Трохузроўневая сістэма слоўнікавых практыкаванняў: вербальна-семантычных, тэзаўрусных, прагматычных / Л. М. Гамеза // Метадалагічныя і метадычныя аспекты выкладання мовы і літаратуры ў школе і

ВНУ : зб. навук. арт. / пад рэд. І.У. Таяноўскай, Т.В.Мальцэвіч. - Мінск: БДУ, 2006. - Вып.5. - С. 5 -10.

34. Гамезо, Л. Н. Риторика на службе профессиональных интересов: пути совершенствования педагогического коммуникативного взаимодействия / Л. Н. Гамезо, В. Ю. Дылевская, О. В. Проскалович, Т. В. Рубаник, С. А. Шантарович // Текст. Язык. Человек : сб. науч. тр.: в 2 ч. /отв. ред.: С.Б. Кураш, В.Ф. Русецкий. -- Мозырь: УО МГПУ им. И. П. Шамякина, 2007. - Ч.2. - С. 126 - 132.

35. Гамезо Л. Л. Креативный подход учителей-новаторов к организации эффективного педагогического речевого взаимодействия / Л. Н. Гамезо, В. Ю. Дылевская, О. В. Проскалович, Т. В. Рубаник, С. А. Шантарович // Текст. Язык. Человек: сб. науч. тр.: в 2 ч. /отв. ред.: С.Б. Кураш, В.Ф. Русецкий. - Мозырь: УО МГПУ им. И.П. Шамякина, 2007. - Ч.2. - С. 124 - 126.

36. Гамезо, Л. Н. Лингводидактические принципы отбора лексики для словаря-минимума учащихся / Л. Н. Гамезо // Актуальные направления методики преподавания русского языка в современной социокультурной ситуации: сб. науч. тр. / М-во образования Респ. Беларусь, НМУ «Нац. ин-т образования» М-ва образования Респ. Беларусь; отв. ред. Л. А. Мурина, В. Ф. Русецкий - Минск: Изд. центр БГУ, 2008. – С. 25 – 28.

**Матэрыялы навуковых, навукова-метадычных і навукова-практычных канферэнцый**

37. Гамеза, Л. М. Аб некаторых пытаннях метадычнай падрыхтоўкі студэнтаў-філолагаў да педагагічнай дзейнасці ў школе (Мінск, 1 – 3 сак. 1991 г.). / Л. М. Гамеза // Навучальны працэс і шляхі яго інтэнсіфікацыі : матэрыялы рэсп. канф. / БДУ. – Мінск, 1991. – С. 51 – 52.

38. Гамеза, Л. М. З вопыту апераджальнага навучання на ўроках беларускай мовы ў V класе пры вывучэнні лексікі / Л. М. Гамеза // Обучающие игры в системе непрерывного образования : материалы респ. науч.-метод. семинара (Минск, 6 – 7 мая 1991 г.). / БГУ. – Минск, 1991. – С. 167 – 169.

39. Гамеза, Л. М. Сістэма работы па ўзбагачэнні слоўніка школьнікаў пры вывучэнні раздзела "Лексіка" ў V - VI класах / Л. М. Гамеза // Узаемасувязі выкладання беларускай і рускай моў і літаратур : матэрыялы рэсп. канф. (Мінск, 15 – 17 мая 1991 г.). / Мінскі гарадскі інстытут удасканалення настаўнікаў. – Мінск, 1991. – С. 45 – 46.

40. Гамеза, Л. М. З гісторыі метадычнай думкі на Беларусі: роля Якуба Коласа ў распрацоўцы пытання ўзбагачэння слоўнікавага запасу вучняў / Л. М. Гамеза // Якуб Колас: праблемы сярэдняй і вышэйшай школы : матэрыялы рэсп. навук.-метад. канф., прысвеч. 110-й гадавіне з дня нараджэння Якуба Коласа (Мінск, 3 – 5 лістап. 1991 г.). – Мінск: БДУ, 1992. – С. 20 – 23.

41. Гамезо, Л. Н. Организация работы учителя по развитию речевой деятельности школьников при изучении лексики родного языка / Л. Н. Гамезо //

Пути повышения качества профессиональной подготовки педагогических кадров с университетским образованием : материалы респ. науч.-практ. конф. (Минск, 9 – 10 окт. 1995 г.). – Минск: БГУ, 1995. – С. 258 – 262.

42. Гамеза, Л. М. Тэарэтычныя асновы фанетыкі школьнага курса беларускай мовы / Л. М. Гамеза // Беларуская мова ў другой палове XX ст. : матэрыялы міжнар. навук. канф. (Мінск, 22 – 24 кастр. 1997 г.). – Мінск: БДУ, 1997. – С. 296 – 297.

43. Гамезо, Л. Н. Основные методы и приемы обогащения словарного запаса школьников при изучении лексики родного языка / Л. Н. Гамезо // Тэорыя і практыка навучання мовам, літаратурам і рыторыцы : матэрыялы міжнароднай навук.-тэарэт. канф. (Мінск, 15 – 17 снежня 1997 г.). – Мінск: БДУ, 1998. – Ч. 2. – С. 57 – 59.

44. Гамеза, Л. М. Праблема развіцця звязнай мовы школьнікаў V – VII класаў на ўроках беларускай мовы / Л. М. Гамеза // Тэорыя і практыка навучання мовам, літаратурам і рыторыцы : матэрыялы міжнар. навук.-тэарэт. канф. (Мінск, 15 – 17 снежня 1997 г.). – Мінск: БДУ, 1998. – Ч. 1. – С. 24 – 26.

45.Гамеза, Л. М. Выкарыстанне паэтычнай спадчыны Янкі Купалы на ўроках вывучэння лексікі беларускай мовы ў школе / Л. М. Гамеза // Матэрыялы Міжнародных Купалаўскіх чытанняў (Гродна, красавік 1997 г.). – Гродна: ГрДУ, 1998. – С. 29 – 33.

46. Гамеза, Л. М. Сучасныя падыходы да выкладання марфалогіі беларускай мовы ў сярэдняй школе / Л. М. Гамеза // Мова — літаратура — культура : матэрыялы міжнар. навук. канф. (Мінск, 16 – 17 лістап. 1999 г.). – Мінск: БДУ, 1999. – С. 159 – 161.

47. Гамеза, Л. М. Да пытання фарміравання культуры маўлення школьнікаў на марфалагічным узроўні (пры вывучэнні катэгорыі роду і ліку назоўнікаў) / Л. М. Гамеза // Язык и социум : материалы междунар. науч. конф. (Минск, 4 – 5 дек.1998 г.). – Минск: БГУ, 2000. – С. 172 – 174.

48. Гамеза, Л. М. Аб некаторых асаблівасцях напісання дыпломных работ па методыцы выкладання школьнага курса беларускай мовы / Л. М. Гамеза // Педагогическое образование в классическом университете: проблемы и перспективы : материалы междунар. науч.-практ. конф. (Минск, 12 окт. 2000 г.). – Минск: БГУ, 2000. – С. 118 – 120.

49. Гамеза, Л. М. Задачы і змест педагагічнай практыкі студэнтаў-філолагаў ВНУ / Л. М. Гамеза // Практыка як састаўная частка прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў : матэрыялы рэсп. міжвуз. навук.-метад. канф. ( Мінск, 1 – 2 лют. 2000 г.). – Мінск: Бел. ун-т культуры, 2000. – С. 29 – 32.

50. Гамеза, Л. М. Гуманітарызацыя адукацыі ў працэсе вывучэння лексікі ў ВНУ / Л. М. Гамеза // Сацыяльна-гуманітарныя навукі ў сістэме вышэйшай школы : матэрыялы навук.-метад. канф. (5 – 6 лют. 2002 г.) / рэдкал.:

А. І. Смолік (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры, 2003. – С. 46 – 50.

51. Гамеза, Л. М. Тэарэтыка-практычныя аспекты арганізацыі самастойнай работы студэнтаў-філолагаў пры выкладанні курса лінгвадыдактыкі / Л. М. Гамеза // Многоуровневая система подготовки филологов: организация содержания и новые технологии обучения : материалы междунар. конф. (Минск, 16 – 17 окт. 2003 г.). – Минск: БГУ, 2004. – С. 237 – 240

52. Гамеза, Л. М. Лексіка асобы як паказчык яе культуры / Л. М. Гамеза // Сацыяльна-культурная дзейнасць: метадалогія, змест, методыка : матэрыялы навук.-метад. канф. (Мінск, 5 – 6 лют. 2003). – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры, 2004. – С. 41 – 48.

53. Гамеза, Л. М. Выяўленне свету асобы ў лексіцы / Л. М. Гамеза // IX Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры : матэрыялы чытанняў (Мінск, 23 – 26 мая 2003 г.). – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры, 2004. – С. 55 – 58.

54. Гамеза, Л. М. Комплексны семанімічны слоўнік беларускай мовы ў сістэме ўзбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў / Л. М. Гамеза // Язык и социум : материалы VI Междунар. конф.: в 2 ч. (Минск, 3 – 4 дек. 2004 г.). – Минск: РИВШ БГУ, 2004. – С. 97 – 101.

55. Гамеза, Л. М. Рэалізацыя камунікатыўна-дзейнаснага падыходу ў працэсе вывучэння беларускай мовы ў школе / Л. М. Гамеза // Текст в лингвистической теории и в методике преподавания филологических дисциплин : материалы III Междунар. науч. конф.: в 2 ч. (Мозырь, 13 -15 мая 2004 г.). – Мозырь: Мозыр. гос. пед. ун-т, 2005. – Ч. 2. – С. 98 – 100.

56. Гамеза, Л. М. Значэнне семанімічнага слоўніка ў выхаванні моўнай культуры навучэнцаў / Л. М. Гамеза // X Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры : матэрыялы чытанняў (Мінск, 24 – 26 мая 2004 г.). – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – С. 22 – 26.

57. Гамеза, Л. М. Псіхалагічныя асновы ўзбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў / Л. М. Гамеза // XI Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры : матэрыялы чытанняў (24 – 26 мая 2005 г.). – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2006. – С. 39 – 43.

58. Гамеза, Л. М. Змест школьнага курса беларускай мовы (5 - 8 класы) у аспекце ўзбагачэння слоўнікавага запасу вучняў / Л. М. Гамеза // Сучасныя падыходы да варыятыўнай моўнай і літаратурнай адукацыі : матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф. (Мінск, 24 лістап. 2006 г.) / пад рэд. Л. А. Мурынай. - Мінск: РІВШ, 2007. - С. 14 - 18.

59. Гамеза, Л. М. Роля арфаэпічных нормаў у культуры маўлення / Л. М. Гамеза // XII Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя

Дням славянскага пісьменства і культуры : матэрыялы чытанняў (24 – 26 мая 2006 г.). – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2007. – С. 31 – 36.

60. Гамеза, Л. М. Працэс узбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў у аспекце асобасна арыентаванага навучання беларускай мове / Л. М. Гамеза // "Мова - Літаратура – Культура" : матэрыялы V Міжнар. навук. канф. (Мінск, 16 – 17 лістап. 2006 г.). – Мінск: Права і эканоміка, 2007. – С. 586 – 589.

**Тэзісы дакладаў**

61. Гамеза, Л. М. Пытанне ўзбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў у "Методыцы роднай мовы" Якуба Коласа / Л. М. Гамеза // Творчая і метадычная спадчына Якуба Коласа : тэзісы дакладаў і паведамленняў рэсп. навук.-метад. канф., прысвеч. 110-й гадавіне з дня нараджэння Якуба Коласа (Мінск, 3 – 5 лістапада, 1991 г.). – Мінск: БДУ, 1992. – С. 59 – 60.

**Слоўнік**

62. Гамеза, Л. М. Комплексны лексічны слоўнік беларускай мовы (сінонімы, антонімы, амонімы, паронімы) / Л. М. Гамеза. – Мінск: Тетра- Системс, 2008. – 304 с.

**Вучэбныя праграмы**

63. Гамеза, Л. М. Праграма спецыяльных курсаў / Л. М. Гамеза, З. Б. Варановіч, В. А. Лашкевіч і інш. – Мінск: БДУ,1992. – С. 5 – 7.

64. Гамеза, Л. М. Узбагачэнне слоўнікавага запасу школьнікаў пры вывучэнні беларускай мовы / Л.М. Гамеза // Рыторыка і методыка выкладання мовы і літаратуры: вучэб. праграмы спецсемінараў для вышэйш. навуч. устаноў па спецыяльнасцях: 1–21 05 01 Беларуская філалогія, 1–21 05 02 Руская філалогія, 1–21 05 04 Славянская філалогія / аўт.-склад. Ф. М. Літвінка, Л. М. Гамеза, В. Ю. Дылеўская [і інш.].– Мн.: БДУ, 2006. – С. 25 – 36.

65. Гамеза, Л. М. Новыя тэхналогіі вывучэння лексікі ў сярэдняй школе / Л.М. Гамеза // Рыторыка і методыка выкладання мовы і літаратуры: вучэб. праграмы спецкурсаў для вышэйш. навуч. устаноў па спецыяльнасцях: 1–21 05 01 Беларуская філалогія, 1–21 05 02 Руская філалогія / аўт.-склад. Ф. М. Літвінка, Л. М. Гамеза, В. Ю. Дылеўская [і інш.].– Мн.: БДУ, 2006. – С.8 – 16.

66. Гамезо, Л. Н. Программа педагогической практики студентов магистратуры филологического факультета / авт.-сост.: Ф. М. Литвинко, Л. Н. Гамезо, И. Э. Савко, И. В. Таяновская, О. И. Царева. – Минск: БГУ, 2009. – 29 с.

**Вучэбна-метадычныя дапаможнікі**

67. Гамеза, Л. М. Метадычныя рэкамендацыі для правядзення лабараторных заняткаў па методыцы беларускай мовы / Л. М. Гамеза, З. Б. Варановіч. – Мінск: БДУ, 1992. – 13 с.

68. Гамеза, Л. М. Спадзяванні на родную мову: функцыянальна-камунікатыўны аспект урокаў па лексіцы ў 5 – 6 класах / Л. М. Гамеза. – Мінск: Універсітэцкае, 1993. – 80 с.

69. Гамеза, Л. М. Практыкум па методыцы выкладання беларускай мовы / Л. М. Гамеза, З. Б. Варановіч, І. М. Саматыя. – Мінск: БДУ, 1998. –30 с.

70. Гамеза, Л. М. Асаблівасці вывучэння гукавога ладу беларускай мовы ў школе / Л. М. Гамеза // Лекции по актуальным вопросам методики преподавания русского и белорусского языка : пособие для студентов филол. фак-тов вузов. – Минск: БГУ, 2003. – С. 70 – 77.

71. Гамеза, Л. М. Методыка выкладання арфаграфіі ў школьным курсе беларускай мовы / Л. М. Гамеза // Лекции по актуальным вопросам методики преподавания русского и белорусского языка : пособие для студентов филол. фак-тов вузов. – Минск: БГУ, 2003. – С. 77 – 85.

72. Гамеза, Л. М. Гісторыя станаўлення і развіцця метадычнай думкі на Беларусі / Л. М. Гамеза // Материалы для самостоятельной работы по методике преподавания белорусского языка : пособие для студентов филол. фак-тов вузов. Серия “КСР”. – Минск: БГУ, 2003. – С. 3 – 10.

73. Гамеза, Л. М. Тэставыя заданні па тэме “Гісторыя станаўлення і развіцця метадычнай думкі на Беларусі / Л. М. Гамеза // Материалы для самостоятельной работы по методике преподавания белорусского языка : пособие для студентов филол. фак-тов вузов. Серия “КСР”. – Минск: БГУ, 2003. – С. 10 – 12.

## RESUME

Gamezo Larisa Nikolaevna

Complex technique of vocabulary enrichment of V - VIII form students on the basis of realization of intra-subject relations during Byelorussian language study

**Keywords:** a complex technique, vocabulary enrichment, intra-subject relations, vocabulary, principle of semantization and compatibility, principle of functioning of word in speech, system of exercises, verbal-semantic, thesaurus, pragmatical levels of vocabulary enrichment.

**The purpose of research** is theoretical substantiation and development of a complex technique of vocabulary enrichment of V – VIII form students on the basis of realization of intra-subject relations during Byelorussian language study, experimental check of its efficiency.

Methods of research are theoretical analysis, pedagogical experiment, statistical analysis, study of student activity product (creative works), advanced pedagogical experience etc.

The scientific novelty of the obtained results consists in theoretical substantiation and development of a complex technique of vocabulary enrichment of V – VIII form students on the basis of realization of intra-subject relations during study of all sections of a school course of Byelorussian language. The new linguistic contents in each section of a school course of Byelorussian language for vocabulary enrichment of V – VIII form students has been determined. Speech mistakes of V – VIII form students that occurred during fulfillment of exercises concerned to infringement of lexical norm, at all language levels, in creative works, have been revealed and analyzed. The new methodical principles have been formulated in addition to existing ones which define work on vocabulary enrichment of the students: 1) vocabulary enrichments of the students on the basis of comprehension of semantics and compatibility of words; 2) vocabulary enrichments of the students on the basis of functioning of a word in speech (texts of the certain types, styles). Author's complex technique of vocabulary enrichment of V – VIII form students on the basis of realization of intra-subject relations during Byelorussian language study has been developed and experimentally checked up. A new "Complex lexical dictionary of Byelorussian language (synonyms, antonyms and other)" for vocabulary enrichment of V – VIII form students has been composed.

The conclusions and results of the research have been used in author's methodical school-books on a technique of teaching of Byelorussian language for philologist teachers and students of philological faculties.

**The application is education and behave.**